# БДУІР: «Студэнты атрымліваюць не толькі дыплом, а і прэстыжную работу»

## Як рыхтуюць лепшых спецыялістаў у галіне ІТ

**Шматлікія тэматычныя курсы, навучальныя праграмы, дапаможнікі, маляўнічыя аб'явы аб якіх сустракаюцца амаль на кожным рагу, сведчаць аб велізарнай папулярнасці прафесіі праграміста і сумежных спецыяльнасцяў. У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі спецыялістаў рыхтавалі яшчэ тады, калі пра існаванне гэтай сферы ў краіне ведалі ледзь не адзінкі. Пра тое, што цяпер з сябе ўяўляе адна з самых аўтарытэтных ВНУ Беларусі, расказаў прарэктар па вучэбнай рабоце, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Барыс НІКУЛЬШЫН.**

### УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ

**«Мы гатовыя цалкам перавесці падачу дакументаў у інтэрнэт»**

БДУІР апраўдвае свой профіль ужо на этапе залічэння. Кожны абітурыент абавязаны стварыць персанальны электронны кабінет для падачы заявы. Сістэма пачала прымяняцца ў 2014 годзе, пасля чаго штогод удасканальваецца. Былі сумненні, што маладыя людзі могуць паставіцца да гэтага насцярожана, але ўжо ў першы год, калі яшчэ мелася альтэрнатыва, больш за 90% усіх заяў былі аформлены праз электронныя кабінеты. Але самастойнае запаўненне дакументаў яшчэ не азначае, што будучы студэнт пакінуты на волю лёсу: на ўсіх этапах у яго ёсць магчымасць праконсультавацца з прыёмнай камісіяй у рэжыме анлайн.

Калі б існавалі база даных атэстатаў і афіцыйны электронны подпіс, а РІКВ прадстаўляў універсітэтам доступ да вынікаў ЦТ, дакументы можна было б падаць, не выходзячы з дома, што істотна палегчыла бы жыццё абітурыентам з рэгіёнаў. Усе тэхнічныя магчымасці для ўвасаблення ідэі ў жыццё ў ВНУ ёсць, засталося дачакацца адлюстравання тэхнічных навінак у заканадаўстве.

Што датычыцца алгарытму залічэння, то ён штогод зацвярджаецца на Савеце ўніверсітэта. Сёлета будзе дзейнічаць тая ж сістэма, што і ў мінулым годзе. Абітурыент у парадку перавагі можа пазначыць усе спецыяльнасці абранага профілю, на тэхніка-тэхналагічным іх 30, на эканамічным кірунку — дзве. Ні ў адной беларускай ВНУ такога няма. Акрамя таго, спецыялісты БДУІР гатовыя маштабіраваць гэтую сістэму на ўсю краіну, пачынаючы з родных універсітэтаў. Гэта значыць, што абітурыент зможа ў парадку перавагі ўказаць спецыяльнасці адразу ў некалькіх ВНУ, а сістэма, у залежнасці ад пажаданняў і набраных балаў, ужо будзе размяркоўваць тых, хто паступае, аўтаматычна.

— Штогод у нас ёсць абітурыенты, якія прынцыпова ўказваюць толькі адну-дзве спецыяльнасці. Гэта даказвае іх мэтанакіраванасць, але мы заўсёды раім, што лепш выкарыстоўваць усе магчымасці і адзначаць максімальную колькасць цікавых для вас спецыяльнасцяў, большасць у сярэднім выбірае 5—7. Вучэбная праграма пабудавана так, што на першых курсах можна перавесціся з адной спецыяльнасці на іншую, а акадэмічная розніца будзе неістотнай, — адзначыў Барыс Нікульшын.

Сёлета ў прыёмнай камісіі разам з традыцыйным папяровым з'явіцца электронны журнал для рэгістрацыі абітурыентаў, так што чэргаў дакладна не будзе. У цэлым, у супрацоўнікаў універсітэта ёсць імкненне да ўкаранення сучасных тэхналогій па максімуме ва ўсе сферы. З далёкасяжных планаў — стварэнне сістэмы «адно акно», калі абітурыент запаўняе дакументы ўсяго раз, пры рэгістрацыі на ЦТ, а далей сістэма дзейнічае без яго ўдзелу.

Калі казаць аб пераліку спецыяльнасцяў, то ён у гэтым годзе змяняцца не будзе. Маштабных перамен варта чакаць абітурыентам наступнага года, калі выйдзе новы класіфікатар спецыяльнасцяў: іх стане менш, некаторыя будуць аб'яднаныя, некаторыя і ўвогуле знікнуць.



Уступная кампанія ў разгары.

На прадстаўленыя цяпер на выбар абітурыентам спецыяльнасці летась прахадныя балы на бюджэтную форму навучання вар'іраваліся ад 244 да 373, на спецыяльнасць «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання». Увогуле на факультэт камп'ютарных сістэм і сетак традыцыйна самыя высокія балы — ад 327.

У студэнтаў, у тым ліку і з Беларусі, ёсць магчымасць выбраць мову навучання: руская або англійская на спецыяльнасцях «Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі», «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў бізнес-менеджменце» (дыстанцыйная форма), «Абарона інфармацыі», «Праграмуемыя мабільныя сістэмы» (дыстанцыйная форма). А навучанне «Інфакамунікацыйным тэхналогіям» наогул праходзіць выключна на англійскай мове.

**СТАЦЬ ЧЭМПІЁНАМ**

27 красавіка пройдзе адкрыты чэмпіянат БДУІР па праграмаванні, самы маштабны на тэрыторыі краіны. Летась у ім прынялі ўдзел 333 каманды з 96 універсітэтаў постсавецкай прасторы. Самі студэнты БДУІР будуць змагацца і на камандным чэмпіянаце свету па праграмаванню ў ЗША — гэта адзіная беларуская каманда, якая выйшла ў фінальны этап самых прэстыжных спаборніцтваў праграмістаў.

### ДЫСТАНЦЫЙНАЕ НАВУЧАННЕ

**Варыянт для студэнтаў з абмежаванымі магчымасцямі ці напружаным працоўным графікам**

Ва ўніверсітэце ўжо 15 гадоў ужываецца методыка дыстанцыйнага навучання. Цяпер на спецыялізаваным факультэце атрымліваюць адукацыю каля 700 чалавек, таксама тэхналогію выкарыстоўваюць каля 200 студэнтаў дзённай формы навучання.

Што гэта азначае? Студэнт можа далучыцца да навучальнага працэсу ў любым пункце зямнога шара, дзе ёсць доступ да інтэрнэту. Ён атрымлівае электронныя версіі матэрыялаў па пераліку дысцыплін, таксама яму прызначаецца цьютар, з якім яны разам фарміруюць сцэнарый навучання. Пры жаданні ён можа інтэнсіфікаваць, заключыўшы дамовы на вывучэнне дадатковых дысцыплін, у выніку праскочыць праз курс і хутчэй скончыць універсітэт.

Эксперымент па выкарыстанні дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій студэнтамі ўсіх формаў навучання працягваецца ўжо другі год. І ўжо з упэўненасцю можна заявіць: тэхналогія вельмі актуальная. На працягу месяца пасля пачатку вучобы можна напісаць заяву аб тым, што ёсць жаданне тую ці іншую дысцыпліну вывучаць дыстанцыйна. Запатрабаванасць тэхналогіі вымяраецца ў чалавека-дысцыплінах, адзін чалавек — адна дысцыпліна, за год іх лік перавышае 800. Часта да такога спосабу адукацыі звяртаюцца тыя, хто аднаўляецца ва ўніверсітэце, здае акадэмічную розніцу ці ж часта з'язджае ў камандзіроўкі па рабоце. Аднак гэта той спосаб, дзе на ўласцівую ўсім студэнтам хітрасць разлічваць не прыходзіцца: усе вынікі фіксуюцца ў электроннай сістэме.



Прарэктар Барыс НІКУЛЬШЫН узнагароджвае прызёраў адкрытага чэмпіянату БДУІР па праграмаванні.

— Практыка паказвае, што дыстанцыйнае навучанне эфектыўна для матываваных людзей, якія сапраўды ведаюць, чаго хочуць, як змогуць прымяняць атрыманыя веды на практыцы, яны з ім спраўляюцца паспяхова. Ёсць студэнты, якія з'яўляюцца толькі на іспытах і без цяжкасцяў атрымліваюць высокія адзнакі. У некаторых выпадках, калі дыстанцыйная вучоба ідзе добра, мы нават дазваляем здаваць экзамены анлайн, асабліва гэта датычыцца людзей з абмежаванымі магчымасцямі, — паведаміў прарэктар.

**БДУІР запрашае**
**1 красавіка 2017 года на Дзень адчыненых дзвярэй**
**«БДУІР — твой выбар!»**

(вуліца П. Броўкі, 4, навучальны корпус №2, актавая зала).

*Пачатак у 11.00.*

**У праграме:**
— фестываль факультэтаў,
— інтэрактыўная пляцоўка «Ствары свой асабісты электронны кабінет абітурыента БДУІР»,
— кансультацыйная пляцоўка прыёмнай камісіі ўніверсітэта,
— выступленне кіраўніцтва і выпускнікоў БДУІР,
— выступленне намесніка дырэктара адміністрацыі ПВТ А.М. Марцінкевіча,
— старт праекта «# ЯвБГУИР: стань студэнтам на адзін дзень» і многае іншае.

### НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС

**«Студэнтаў, якія не працуюць па спецыяльнасці, у нас адзінкі»**

Спецыфіка навучання ў гэтай ВНУ прадугледжвае значную перавагу практыкі над тэорыяй. На базе БДУІР дзейнічае каля 40 лабараторый, створаных разам з рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій і іншымі фірмамі, якія займаюцца распрацоўкай ІТ-тэхналогій. Гэта нагадвае заходні стыль працы, калі кампаніі пачынаюць клапаціцца аб сваіх кадрах загадзя: яны прыходзяць на ўніверсітэт і рыхтуюць іх для сябе ў працэсе навучання. Дапамагаюць універсітэту стварыць добрую матэрыяльную базу, праводзяць дадатковае навучанне як са студэнтамі, так і з выкладчыкамі, разам ладзяць сацыяльна значныя праекты і — самае галоўнае — залучаюць маладых спецыялістаў у стварэнне канкурэнтаздольнага прадукта.

— Праблемы з размеркаваннем студэнтаў у нас папросту не існуе. Хутчэй, узнікаюць пытанні з недахопам нашых выпускнікоў. Попыт на нашых спецыялістаў сапраўды высокі, — адзначыў Барыс Нікульшын.

У БДУІР створаны сертыфікацыйныя цэнтры для навучання студэнтаў па праграмах сусветных лідараў ІТ-галіны: CISCO, SAP, National Instruments. Іх праходжанне дазваляе атрымаць сертыфікат, які высока цэніцца ва ўсім свеце. Акрамя таго, на некаторых спецыяльнасцях гэтыя праграмы інтэграваны ў навучанне. Нават школьнікі, а дакладней навучэнцы ліцэя №1 г. Мінска пры БДУІР, праходзяць такія курсы. Калі пры паступленні ў абітурыента паўпрахадны бал, наяўнасць згаданага сертыфіката лічыцца яго перавагай.

— У нашай галіне не мае сэнсу атрымліваць веды толькі з кніг. Пакуль яна будзе выдадзеная, частка інфармацыі ўжо састарэе. Кампаніі, якія з намі супрацоўнічаюць, прыносяць нам найноўшыя тэхналогіі, нічога не хаваючы, бо потым нашы выпускнікі будуць у гэтых кампаніях імі ж карыстацца. Ужо з трэцяга курса большасць студэнтаў пачынаюць працаваць па спецыяльнасці, некаторыя нават да канца вучобы адкрываюць свае фірмы. Дарэчы, на базе нашага ўніверсітэта дзейнічае бізнес-інкубатар, або, як мы яго інакш называем, Цэнтр прафесійнага развіцця. Тут абсалютна бясплатна вядучыя эксперты ІТ-сферы праводзяць майстар-класы. Многія нашы выкладчыкі працуюць у ПВТ, ды нават студэнтам ёсць што расказаць. Узяць хоць бы студэнтаў пятага курса Дзмітрыя Курылу, аднаго са стваральнікаў нашумелай праграмы «Маскарад», ці Паўла Літвінку, які працуе над мабільнай праграмай, што дазволіць любімі запытамі кіраваць з дапамогай голасу. Былыя студэнты самі імкнуцца прыйсці да нас выкладаць, бо іх гэта захапляе. Гэта чарговы раз даказвае, што вучоба арганізавана ў нас не фармальна, а цікава і функцыянальна, — падвёў вынік Барыс Віктаравіч.



Выпускніцы магістратуры БДУІР.

Матэрыялы падрыхтавалі Дар'я КАСКО, Алена ДАЎЖАНОК.

УНП 100363945.